https://doi.org/10.5281/zenodo.18034094
УДК [026:63]:001.891:94 «1941/1945»

CC BY 4.0

✉ *В. Б. Бабарыка-Амельчанка, Д. П. Бабарыка*

# Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце навуковай работы галіновай бібліятэкі: з практыкі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі



**Бабарыка-Амельчанка Вераніка Барысаўна,**
*Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аддзел даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці, загачык аддзела (Мінск, Беларусь)*
*ORCID ID: 0000-0003-0439-4265*
*РИНЦ AuthorID: 1018059*
*Email: b-amelchanka@belal.by*



**Бабарыка Дзмітрый Пятровіч,**
*Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце (Мінск, Беларусь)*
*РИНЦ AuthorID: 1090912*
*Email: babariko@belal.by*

**Анатацыя.** Звяртанне да тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны ўключана ў працэс актуальнага фарміравання гістарычнай памяці і развіцця сучаснага беларускага грамадства. Вывучэнне фактаў і асэнсаванне значэння гэтых падзей айчыннай гісторый, а таксама захаванне ўдзячнасці да праяўленнага народнага подзвігу характэрна для ўсіх сацыяльных інстытуцый краіны, у тым ліку бібліятэчных устаноў розных тыпаў і ведамаснай прыналежнасці. У артыкуле на прыкладзе аднаго з накірункаў дзейнасці рэспубліканскай галіновай навуковай бібліятэкі разгледжана ўцягнутасць бібліятэчна-інфармацыйнай сферы ў агульнанацыянальны працэс: прадстаўлены агляд навуковай работы Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў межах даследчай, рэдакцыйна-выдавецкай і навукова-арганізацыйнай работы ў кантэксце прымеркавання да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Паказана, што цягам апошніх двух гадоў вынікі рознааспектнай даследчай, пошукава-аналітычнай і навукова-асветніцкай дзейнасці, звязанай з Вялікай Айчыннай вайной, былі прадстаўлены ў навуковых публікацыях і падчас выступаў з дакладамі, а таксама ў форме выставы матэрыялаў і лічбавага інфармацыйнага рэсурса. У ажыццяўленні рэдакцыйна-выдавецкай работы акрэсленая тэматыка ўвасобілася ў якасці цэнтральнай тэмы нумароў навуковага часопіса “Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс” і падрыхтоўцы манаграфічнага нарыса “«Зара» – газета-партызанка”. Акрамя таго, былі арганізаваныя два спецыялізаваныя круглыя сталы і ў праблемнае поле дзвюх навуковых канферэнцый была ўключана тэма Вялікай Айчыннай вайны. Адзначана, што дадзеная тэматыка мае патэнцыял для рэалізацыі ў навуковай рабоце бібліятэкі і надалей.

***Ключавыя словы:*** *Вялікая Айчынная вайна, навковая работа бібліятэк, Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка, даследаванні, публікацыі, выданні, навуковыя мерапрыемствы, гістарычная памяць.*

***Для цытавання:*** *Бабарыка-Амельчанка, В. Б. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце навуковай работы галіновай бібліятэкі: з практыкі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі / В. Б. Бабарыка-Амельчанка, Д. П. Бабарыка // Библиотечно-информационный дискурс. – 2025. – Т. 5, No 1–2. – С. 81–89. https://doi.org/10.5281/zenodo.18034094*

*Артыкул паступіў: 15.12.2025*

*Артыкул прыняты да друку: 24.12.2025*

*Артыкул апублікаваны: 29.12.2025*

© *Бабарыка-Амельчанка В.Б., Бабарыка Д. П., 2025*

***Veranika B. Babaryka-Amelchanka, Dzmitry P. Babaryka***

# The theme of the Great Patriotic War in the context of the research activities of a sectoral library: from the practice of the Belarusian Agricultural Library

Veranika B. Babaryka-Amelchanka
*I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Department of Research, Scientific and Methodological Activity, Head of the department (Minsk, Belarus)*
*ORCID ID:* *0000-0003-0439-4265*
*RSCI AuthorID:* *1018059*
*Email:* *b-amelchanka@belal.by*

Dzmitry P. Babaryka
*I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Deputy Director for Science (Minsk, Belarus)*
*RSCI AuthorID:* *1090912*
*Email:* *babariko@belal.by*

**Abstract.** The reference to the theme of the Great Patriotic War is incorporated into the ongoing process of shaping historical memory and fostering the development of modern Belarusian society. Exploring the facts, understanding their historical significance in national history, as well as preserving gratitude for the people's feat are typical of all social institutions in the country, including libraries of different types and departmental affiliation. The article, through the example of activity areas of a republican sectoral scientific library, highlights the role of the library and information sphere in the national process. It presents a review of scientific activities of the I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, encompassing research, editorial publishing, and scientific organizational work, in the context of commemorating the 80th anniversary of the liberation of Belarus from German Fascist occupation and the 80th anniversary of Victory in the Great Patriotic War. It is shown that over the past two years the results of diverse research, search analytical, and scholarly educational activities related to the Great Patriotic War have been presented in scientific publications and conference reports, as well as in the form of an exhibition of materials and a digital information resource. In the course of editorial and publishing work, the outlined theme was embodied as the central topic of issues of the scholarly journal "Library & Information Discourse" and in the preparation of the monographic essay «"Zarya" – the partisan newspaper». Furthermore, two specialized round tables were organized, and the theme of the Great Patriotic War was incorporated into the problem field of two scientific conferences. It has been emphasized that this topic remains promising for further implementation in the scientific work of the library.

***Keywords:*** *Great Patriotic War, library research work, Belarusian Agricultural Library, research, publications, editions, scientific events, historical memory.*

***For citation:*** *Babaryka-Amelchanka V. B., Babaryka D. P. The theme of the Great Patriotic War in the context of the research activities of a sectoral library: from the practice of the Belarusian Agricultural Library. Bibliotechno-informatsionnyi diskurs = Library & Information Discourse, 2025, vol. 5, no. 1–2, pp. 81–89 (in Belarusian).* *https://doi.org/10.5281/zenodo.18034094*

*The article was received: 15.12.2025*
*The article was accepted for publication: 24.12.2025*
*Article published: 29.12.2025*

© *Бабарыка-Амельчанка В.Б., Бабарыка Д. П., 2025*

**Уводзіны**

Вялікая Айчынная вайна назаўсёды ўпісана ў гісторыю Беларусі як адна з яе найбольш трагічных і ў той жа час гераічных старонак. Захаванне памяці аб падзеях ваеннага ліхалецця і мужнай барацьбы за свабоду з'яўляецца падзякай за магчымасць мірнага існавання ўсіх наступных пакаленняў беларусаў і напамінам аб недапушчальнасці новых войнаў на нашай зямлі.

Для большасці насельніцтва сучаснай Беларусі рэха Вялікай Айчыннай вайны застаецца датычным асабіста – праз лёсы і ўспаміны родных, якія перадаюцца нашчадкам. У той жа час значная ўвага пытанням асэнсавання і значэння Вялікай Айчыннай вайны ў грамадскай свядомасці надаецца ў межах ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі і дзяржаўнага будаўніцтва. У цяперашні час Вялікая Айчынная вайна працягвае рознабакова разглядацца сацыяльнымі інстытуцыямі краіны: на ўсіх узроўнях адукацыйнай сістэмы адбываецца вывучэнне падзей і ўрокаў вайны, навуковымі ўстановамі даследуюцца новыя факты і кумулююцца грунтоўныя веды па ваеннай гісторыі і яе ўплыве на сучаснасць і будучыню, арганізацыямі асветы, культуры і сродкамі масавай інфармацыі тэмы, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, асвятляюцца сярод шырокага кола насельніцтва, паўсюдна надаецца ўвага ўшаноўванню гістарычнага мінулага і далучэнню да ініцыятыў па захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, фарміраванні гонару за Вялікую Перамогу, удзячнасці народу-пераможцу. Свой унёсак у гэтую справу робяць і бібліятэкі краіны.

Культурна-асветніцкая, праектная і навукова-даследчая дзейнасць, звязаная з Вялікай Айчыннай вайной, характэрная для бібліятэчных устаноў розных тыпаў і ведамаснай прыналежнасці. Мэта дадзенай работы – разгледзіць навуковую работу Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў кантэксце прымеркавання да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзеля гэтага плануецца асвяціць звяртанне да акрэсленай тэматыкі ў межах даследчай і рэдакцыйна-выдавецкай работы, а таксама пры арганізацыі навуковых мерапрыемстваў двух апошніх гадоў.

**Тэматыка Вялікай Айчынна вайны ў даследчай дзейнасці**

Даследчая дзейнасць Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі праз прызму тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны вялася ў некалькіх накірунках:

– гісторыя Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі;
– гісторыя аграрнай навукі;
– гісторыка-кнігазнаўчыя даследаванні;
– захаванне гістарычнай памяці.

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка была створана ў пасляваенны час: на базе існуючай з 1957 года бібліятэкі Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР у адпаведнасці з Распараджэннем Савета Міністраў БССР № 162-р ад 10 лютага 1960 года была арганізавана Беларуская рэспубліканская навуковая сельскагаспадарчая бібліятэка [1, с. 202]. Такім чынам, дзейнасць самой установы храналагічна не была закранутая ваеннымі падзеямі. Тым не менш, юбілеі памятных дат, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, сталі падставай да таго, што ўпершыню адным з аспектаў вывучэння гісторыі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі стала правядзенне гісторыка-біяграфічнага даследвання кадравага складу бібліятэкі ў мэтах выяўлення работнікаў – удзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Цягам двух гадоў вялася пошукавая работа ў бягучым архіве Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі: былі прагледжаны больш за 500 асабістых спраў і выяўлены каля 20 супрацоўнікаў, чые лёсы закранула вайна. Біяграфічныя звесткі і дасягненні 11 работнікаў, якія змагаліся на франтах Другой сусветнай вайны і ўдзельнічалі ў партызанскім руху, у тым ліку першага дырэктара бібліятэкі М.Л. Жука, былі выкладзены ў двух навуковых артыкулах і падчас двух выступленняў з дакладамі. Пры падрыхтоўцы гэтых матэрыялаў біяграфічныя звесткі па канкрэтных персаналіях адшукваліся таксама ў іншых архівах, рэсурсах свабоднага доступу (“Память народа”, “Подвиг народа” і “Партизаны Беларуси”), апублікаваных работах [2].

Улічваючы галіновы характар Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі, значная ўвага надаецца вывучэнню і папулярызацыі сельскагаспадарчых ведаў і аграрнай навукі, у тым ліку гістарычным, навуказнаўчым і біяграфічным даследаванням. Да пачатку 1940-х гадоў былі сфарміраваны і развіваліся даследаванні па ўсіх асноўных галінах сельскай гаспадаркі. Распачаўшаяся вайна стала выпрабаваннем для ўсяго беларускага насельніцтва. Лёс свайго народа ў гады ліхалецця раздзялялі і прадстаўнікі аграрнай навукі: навукоўцы і супрацоўнікі навуковых устаноў запісваліся добраахвотнікамі ў Чырвоную армію і ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях, папаўнялі шэрагі партызан і

падпольшчыкаў, дбалі на працоўным фронце ва ўмовах эвакуацыі. Аб дзеячах аграрнай навукі – чатырох акадэміках (Дарожкін М.А., Севярнёў М.М., Скарапанаў С.Г., Юскавец М.К.) і чатырох членах-карэспандэнтах (Іваноў С.Н., Івіцкі А.І., Качура І.М., Пракопаў П.Я.), якія не толькі зрабілі значны ўнёсак ў развіццё навукі Беларусі, але і змагаліся супраць фашызму ў Вялікую Айчынную вайну на падставе дакументальных крыніц, апублікаваных успамінаў і навуковай літаратуры быў падрыхтаваны даклад.

Разглядаліся таксама экалагічныя наступствы войнаў, а менавіта малавывучаны аспект, звязаны з палемахорнымі заносамі. На падставе расійскіх і беларускіх даследаванняў у галіне батанікі, экалогіі і прыродакарыстання былі сабраныя звесткі аб асноўных шляхах заносаў палемахораў, прадстаўніках чужароднай флоры, уплыве палемахораў на прыродныя экасістэмы. Па выніках вывучэння гэтага накірунку былі падрыхтаваныя два даклады, адзін з якіх пленарны, а таксама публікацыя, якая прынятая да друку.

Акрамя таго, у сувязі з юбілейнымі датамі вызвалення Беларусі і Вялікай Перамогі, надавалася ўвага вывучэнню адметнага спосабу захавання гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне – праз найменні гатункаў кветкавых раслін, якія ствараліся беларускімі, савецкімі і расійскімі селекцыянерамі. Разглядаліся аўтары-селекцыянеры, а таксама шматлікія гатункі бэзу, руж, касачэй, вяргіній, півоній, язміну і іншых кветак, назвы якіх увекавечылі падзеі вайны, асобныя групы ўдзельнікаў барацьбы за свабоду і персаналій, сімвалы і помнікі перамогі. Вынікі гэтай работы былі прадстаўлены ў двух дакладах, у тым ліку пленарным, і ў двух публікацыях [3; 4].

У рамках раскрыцця тэмы барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі даследаваўся падпольны і партызанскі друк Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Разглядаліся агульныя пытанні перабудовы друку ў сувязі з пачаткам вайны, спосабы распаўсюджвання газет на акупаваных тэрыторыях, значнасць падпольнай прэсы ў арганізацыі супраціву акупантам у цэлым, яе роля ў інфармаванні і мабілізацыі насельніцтва, самі друкаваныя перыядычныя прыфрантавыя і падпольныя выданні.

Грунтоўнае гісторыка-кнігазнаўчае даследаванне было прысвечана падпольнай дзейнасці органа Брэсцкага абкама КП(б)Б – газеце “Зара” (1943–1944 гг.). Вялася пошукавая работа ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, архіве рэдакцыі брэсцкай абласной газеты “Зара”. Вывучаны матэрыялы абласной і гарадской бібліятэк г. Брэста, анлайн-рэсурсы, прысвечаныя гэтай тэме. Прапрацаваны пасляваенныя выпускі газеты “Зара”. Праведзены кансультацыі з галоўным рэдактарам газеты “Зара” ў 2012–2022 гады А.А. Лагвіновічам і дзеючым галоўным рэдактарам гэтай газеты І.У. Гетманам. Па выніках даследаванняў падрыхтаваны два даклады, у тым ліку пленарны, і апублікаваны тры навуковыя работы [5–7], а таксама падрыхтаваны манаграфічны нарыс, які выйдзе з друку да канца 2025 года.

Разглядалася таксама гісторыя газеты “Красноармейская правда” (зараз – «Белорусская военная газета. Во славу Родины»), айчынны прыфрантавы друк, беларускія перыядычныя сатырычныя выданні перыяду Вялікай Айчыннай вайны і інш. Усяго за два гады па тэме беларускага перыядычнага друку ў гады Вялікай Айчыннай вайны падрыхтаваны 7 навуковых артыкулаў [5–11] і зроблена 5 дакладаў.

Захаванне гістарычнай памяці з'яўляецца грамадзянскім абавязкам сучаснікаў. З нагоды 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкай быў створаны інфармацыйны веб-праект “Помнім. Ганарымся. Дзякуем”. Гэты рэсурс мае мемарыяльны і асветніцкі характар, складаецца з трох раздзелаў – “Акадэмічныя навукоўцы-аграрыі – удзельнік ВАВ”, “Супрацоўнікі бібліятэкі – удзельнікі ВАВ”, “«Кніга Памяці» сваякоў супрацоўнікаў – удзельнікаў ВАВ”, і змяшчае вынікі праведзеных бібліятэкай даследаванняў і асабістыя гісторыі сучасных супрацоўнікаў бібліятэкі, заснаваныя на успамінах родных і ўласных адшуканнях. Акрамя таго, была падрыхтавана выстава матэрыялаў “«Зара» – газета-партызанка”, якая ўключыла копіі выпускаў газеты, выдадзеных напярэдадні нападу гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз і ў 1943–1944 гады, арыгіналы якіх знаходзяцца ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, архіве рэдакцыі брэсцкай абласной газеты “Зара”, а таксама асабістым архіве І.Ф. Багданавай і Н.Ф. Багданавай – старшых навуковых супрацоўнікаў аддзела даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі. Дакументальныя матэрыялы дапоўнены навуковым каментарыем.

Вывучаўся ўнёсак бібліятэчнай галіны ў захаванне і

перадачу спадчыны аб Вялікай Айчыннай вайне. Аналізаваліся інтэрнэт-рэсурсы сайтаў бібліятэк Беларусі, прысвечаныя юбілейным датам. Па тэме віртуальных праектаў бібліятэк былі падрыхтаваны тры публікацыі, дзве з іх у сааўтарстве з Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкай імя А.С. Пушкіна апублікаваныя [12; 13], адна прынятая да друку.

Такім чынам, вынікі даследчай, пошукава-аналітычнай і навукова-асветніцкай дзейнасці Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі ў кантэксце прымеркавання да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне былі прадстаўлены ў навуковых публікацыях і падчас выступаў з дакладамі, а таксама ў форме выставы матэрыялаў і лічбавага інфармацыйнага рэсурса.

**Рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць, звязаная з тэмай Вялікай Айчыннай вайны**

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка з'яўляецца заснавальнікам навуковага рэцэнзуемага часопіса "Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс". Рэдкалегіяй выдання было прынята рашэнне аб тым, што ў нумарах 4 тома (2024 г.) будзе нададзена ўвага размяшчэнню матэрыялаў, якія адпавядаюць раздзелам часопіса і звязаныя з перыядам Вялікай Айчыннай вайны, вызваленнем ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пасляваенным аднаўленнем, а таксама захаваннем памяці аб гэтых старонках гісторыі (малюнак 1). У выніку палова артыкулаў, якія выйшлі ў нумарах часопіса "Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс" у 2024 годзе датычыліся тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Такая ж тэндэцыя характэрная да артыкулаў, пададзеных у 2025 годзе.

ВСТУПИТЕЛЬНОЕ СЛОВО ГЛАВНОГО РЕДАКТОРА

**ВСТУПИТЕЛЬНОЕ СЛОВО ГЛАВНОГО РЕДАКТОРА**

**Уважаемые читатели и авторы!**

Перед вами специализированный выпуск нашего журнала, посвященный юбилейной дате — 80-летию освобождения Беларуси Красной Армией от немецко-фашистских захватчиков в ходе Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг. Все эти годы мы продолжаем чтить и сохранять память о подвиге наших предков.

Нападение немецко-фашистских захватчиков без объявления войны на рассвете 22 июня 1941 г. ввергло нашу страну в Великую Отечественную войну — самую жестокую, тяжелую и кровопролитную войну в истории человечества.

Политическая цель войны против СССР чётко была определена Гитлером 30 марта 1941 г.: «Наши задачи в России: разбить вооружённые силы, уничтожить государство... Речь идёт о войне на уничтожение», — сражаются до последнего человека».

Беларусь с самых первых часов войны стала местом ожесточенных сражений. Сотни подвигов совершили в приграничных районах в первые же часы и дни войны советские воины. В небе Бреста были совершены одни из первых воздушных таранов в истории Великой Отечественной войны.

Враг, привыкший к легким победам в Западной Европе, был ошеломлен мужеством и стойкостью советских бойцов и командиров, их беззаветной преданностью своему народу, Родине. Гитлеровцы вынуждены были признать бесстрашие советских воинов и свои большие потери. Так, бывший начальник 4-й немецко-фашистской армии, наступавшей в полосе Бреста, генерал Блюментрит заявил: «Начальная битва в июне 1941 г. впервые показала нам Красную Армию. Наши потери доходили до 50 процентов ...». Под Брестом «...

**Малюнак 1. – Фрагмент уступнага слова галоўнага рэдактара навуковага часопіса "Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс" да выхаду тэматычнага нумара (2024, т. 4, №1)**

**Figure 1. – Excerpt from the foreword of the editor in chief of the scholarly journal "Library & Information Discourse" to the release of the thematic issue (2024, Vol. 4, No. 1)**

У артыкулах, якія ўвайшлі ў тэматычныя нумары часопіса "Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс" аўтары з Беларусі і Расіі звярталіся да разгляду праблем падпольнага перыядычнага друку і арганізацыі супрацьфашысцкай прапаганды сродкамі масавай інфармацыі на часова акупаваных тэрыторыях савецкай дзяржавы; міжнацыянальнага ўзаемаўдзелу ў справе барацьбы за вызваленне краіны; аднаўлення акадэмічнай бібліятэкі ў пасляваенныя гады; удзелу бібліятэчных работнікаў у падпольнай і пратызанскай барацьбе; а таксама сучаснай дзейнасці бібліятэк, скіраванай на вывучэнне і захаванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Таксама ў межах рэдакцыйна-выдавецкай работы раскрыццё акрэсленай тэматыкі ўвасобілася ў фармаце навуковага кніжнага выдання. Падрыхтаваны і перададзены ў друк манаграфічны нарыс "«Зара» – газета-партызанка" (малюнак 2), які будзе выдадзены ў 2025 годзе.




**Малюнак 2. – Вокладка навуковага выдання Богданова, И. Ф. «Заря» – газета-партизанка / И. Ф. Богданова, Н. Ф. Богданова ; Бел. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича Нац. акад. наук Беларуси. – Минск : ИВЦ Минфина, 2025 – 376 с.**

**Figure 2. – Cover of the scholarly publication: Bogdanova, I. F. "Zarya" – the partisan newspaper / I. F. Bogdanova, N. F. Bogdanova; I. S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus. – Minsk: Ministry of Finance Information and Computing Center, 2025. – 376 p.**

Выданне падрыхтавана старшымі навуковымі супрацоўнікамі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі І.Ф. Багданавай і Н.Ф. Багданавай. Падставай правядзення даследавання стала спалучэнне асэнсавання Вялікай Айчыннай вайны праз прызму сямейнай гісторыі і вывучэння падпольнага другу на Беларусі. Такім чынам у фокусе ўвагі даследчыкаў паўстаў партызанскі перыяд найстарэйшай газеты Брэстчыны "Зара", падчас якога наборшчыцай з'яўлялася стрыечаная бабуля аўтараў Н.К. Лагвіна. У манаграфічным нарысе на падставе матэрыялаў дзяржаўных, ведамасных і сямейных архіваў, а таксама навуковых публікацый, мемуарнай літаратуры, публіцыстыкі, электронных інфармацыйных рэсурсаў разглядаецца дзейнасць Брэсцкай абласной газеты "Зара" на фоне гістарычных умоў, якія склаліся на Брэстчыне пасля Рыжскай мірнай дамовы і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У кнігу ўвайшлі звесткі аб кадравым складзе падпольнай рэдакцыі газеты, адлюстравана спецыфіка працы рэдакцыі на часова акупаванай тэрыторыі Брэсцкай вобласці, прааналізаваны змест апублікаваных матэрыялаў. У выданне ўключаны факсімільныя копіі падпольных выпускаў "Зары" (1943–1944), выяўленыя ў ходзе пошукавай работы. Кніга адрасуецца шырокаму колу чытачоў, можа быць выкарыстана ў навуковых, адукацыйных, выхаваўчых і асветніцкіх мэтах.

**Увага да Вялікай Айчыннай вайны ў межах навукова-арганізацыйнай работы**

Навукова-арганізацыйная работа Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі таксама была скіравана на ўвагу да памятных дат 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: былі праведзены два мэтавых навуковых мерапрыемствы і дзве політэматычныя канферэнцыі, прымеркаваныя да юбілеяў азначаных гістарычных падзей. Змястоўнае напаўненне мерапрыемстваў ладзілася на падставе супрацоўніцтва з навуковымі арганізацыямі, установамі вышэйшай адукацыі, архівамі.

Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкай быў ініцыяваны, арганізаваны, падрыхтаваны і праведзены 4 ліпеня 2024 года круглы стол "Дарогамі барацьбы да вызвалення", прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Аддзялення аграрных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі і іншых устаноў.

Асноўныя тэмы абмеркавання ўключалі актуальныя пытанні вывучэння гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (даклад Грэбеня Я.А. на тэму «Актуальныя пытанні вывучэння гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны»), падпольную выдавецкую дзейнасць на акупаваных тэрыторыях (даклад Багданавай І.Ф. "«Зара» – газета КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны"), удзел акадэмічных вучоных-аграрыяў (даклад Бабарыка Д.П. "У адзіным страі: вучоныя-аграрыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны") і работнікаў бібліятэкі (Марозаў В.М. "Супрацоўнікі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны") у баявых дзеяннях, партызанскай і падпольнай барацьбе, а таксама іх доблесная праца ў ваенныя гады. Асаблівая ўвага была нададзена дакументальным аўдыёвізуальным матэрыялам, у якіх захавалася вызваленне Беларусі (даклад Пятліцкай Н.А. "Вызваленне Беларусі па фондах Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў").

Акрамя асноўных дакладаў і абмеркавання, адбыліся выступленні ўдзельнікаў круглага стала, якія раскрываюць ролю Вялікай Айчыннай вайны ў лёсе беларускага народа праз прызму сямейнай гісторыі. Апавяданні нашчадкаў, заснаваныя на ўспамінах сваякоў і выніках асабістай пошукавай работы, аб жыцці ў гады ваеннага ліхалецця, удзеле ў баявых дзеяннях, партызанскай і падпольнай барацьбе, дапамозе ў забеспячэнні патрэб сіл супраціўлення і вызвалення падкрэслілі значнасць гэтых трагічных старонак гісторыі ў жыцці кожнага беларуса, а таксама прадэманстравалі пераемнасць паміж пакаленнямі і дазволілі яшчэ раз выказаць падзяку за магчымасць жыцця пад мірным небам.

У завяршэнні мерапрыемства адбыўся паказ дакументальнага фільма "Вызваленне", падрыхтаванага супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. Таксама ўвазе ўдзельнікаў круглага стала былі прапанаваны падрыхтаваныя супрацоўнікамі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі

экспазіцыйныя матэрыялы: адбылося адкрыццё матэрыялаў "«Зара» – газета-партызанка" і дэманстравалася тэматычная выстава выданняў "Працы акадэмічных вучоных-аграрыяў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны".

24 чэрвеня 2025 года ў Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэцы адбыўся круглы стол "Дарогамі барацьбы да вызвалення", прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннае вайне. Да яго работы далучыліся прадстаўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Смаленскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні, Інстытута мяса-малочнай прамысловасці, Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі і іншых устаноў.

Асноўныя тэмы абмеркавання датычыліся разгляду ўнёску савецкага народа ў разгром нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў і значэння неўміручага подзвігу народа-пераможцы (даклад В.П. Гарматнага "Подзвігу народа жыць у стагоддзях. Да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне"); біяграфічнага агляду персаналій "беларускіх смалян" і "смаленскіх беларусаў", ушанаваных званнем Героя Вялікай Айчыннай вайны (даклад Т.М. Ладожынай "«Беларускія смаляне» і «смаленскія беларусы» – героі Вялікай Айчыннай вайны" у сааўтарстве з В.А. Касап і М.Л. Царагародцавай); увагі да наступстваў, звязаных з занясеннем раслін-палемахораў на савецкія тэрыторыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (даклад І.Ф. Багаданавай і Н.Ф. Багданавай "Палемахоры Расіі і Беларусі – горкая памяць зямлі"); удзелу работнікаў Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі ў баявых дзеяннях, партызанскай, падпольнай барацьбе і доблеснай працы ў гады Вялікай Айчыннай вайны (даклад В.М. Марозава "Супрацоўнікі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны"); а таксама асветніцкай работы па раскрыцці нацыянальных архіўных аўдыёвізуальных матэрыялаў, якія захавалі гісторыю Вялікай Перамогі (даклад М.У. Гарэліка "Праект «Адкрыты кінаархіў» Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў: «Гісторыя Вялікай Перамогі»").

Прагарама мерапрыемства ўключала паказ дакументальнага фільма "Гісторыя Вялікай Перамогі", створанага Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў. У ходзе работы круглага стала таксама дэманстраваліся экспазіцыйныя матэрыялы "«Зара» – газета-партызанка", падрыхтаваныя работнікамі Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі па выніках пошукавай і даследчай дзейнасці, і тэматычныя выставы выданняў "Вялікая Айчынная вайна ў кнігах: з фонду Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі" і "Працы акадэмічных вучоных-аграрыяў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны".

**Заключэнне**

Такім чынам, характарызуючы навуковую работу Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі ў кантэксце прымеркавання да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, падсумуем. На працягу 2024 і 2025 гадоў былі апублікаваныя 14 артыкулаў (5 – у навуковых часопісах [2; 5; 7; 10; 12], 7 – у матэрылах канферэнцый [3; 4; 6; 8; 9; 11; 13] і 2 – у інфармацыйным выданні [14; 15 ]) і яшчэ 5 прынятыя да друку, зроблена 12 дакладаў, з іх 4 пленарных, на навуковых мерапрыемствах, якія адбыліся ў Мінску, Брэсце, Смаленску і Маскве. Акрамя таго, вынікі даследчай работы былі прадстаўлены ў навукова-асветніцкай форме – у выглядзе інфармацыйнага веб-рэсурса і выставы матэрыялаў. У межах рэдакцыйна-выдавецкай работы былі выпушчаны тэматычныя нумары часопіса "Бібліятэчна-інфармацыйны дыскурс", а таксама падрыхтавана кніжнае навуковае выданне. Да таго, былі арганізаваныя два спецыялізаваныя круглыя сталы і ў праблемнае поле дзвюх навуковых канферэнцый была ўключана тэма Вялікай Айчыннай вайны.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны мае вялікае сацыяльнае значэнне для развіцця сучаснага беларускага грамадства. Вывучэнне Другой сусветнай вайны і асэнсаванне яе значэння, фарміраванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і захаванне ваеннай спадчыны з'яўляецца агульнанацыянальным працэсам. Прыведзеныя прыклады з навуковай дзейнасці Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі гэта пацвярджаюць.

Патэнцыял тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў шырокім сэнсе невычарпальны, таму і работа Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі ў гэтым накірунку працягваецца, дадаючы свой унёсак у інтэлектуальныя назапашванні айчыннай навукі, культуры і асветы.

## Список использованных источников


1. Жук, В. Н. История и деятельность Белорусской сельскохозяйственной библиотеки. Кн. 1. Предыстория и годы становления (1957–1974) / В. Н. Жук, В. Б. Бабарико-Омельченко ; редкол.: В. Б. Бабарико-Омельченко [и др.]. – Мн. : Ковчег, 2020. – 228 с.
2. Морозов, В. Н. Сотрудники Белорусской сельскохозяйственной библиотеки – участники Великой Отечественной войны: М. Л. Жук, А. А. Гук, Я. Т. Кондратенков, Н. П. Латышев / В. Н. Морозов // Библиотечно-информационный дискурс. – 2024. – Т. 4, № 1. – С. 73–81. https://doi.org/10.5281/zenodo.12704267
3. Богданова, И. Ф. Цветы победы / И. Ф. Богданова // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / НАН Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2025. – С. 105–130. https://doi.org/10.5281/zenodo.17097982
4. Богданова, Н. Ф. Селекционеры – участники Великой Отечественной войны и современные селекционеры в области декоративного садоводства, авторы сортов растений, посвященных Великой Отечественной войне / Н. Ф. Богданова // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / НАН Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2025. – С. 223–235. https://doi.org/10.5281/zenodo.17097982
5. Богданова, И. Ф. «Заря» – газета-партизанка / И. Ф. Богданова, Н.Ф. Богданова // Библиотечно-информационный дискурс. – 2024. – Т. 4, №1. – С. 13–41. https://doi.org/10.5281/zenodo.12704216
6. Богданова, И. Ф. Брестская областная газета «Заря» в период Великой Отечественной войны: сохранение памяти / И. Ф. Богданова, Н.Ф. Богданова // 1944 г. Наследие освобождения Беларуси в исторических исследованиях и семейных архивах : материалы междунар. науч.-практ. конф. (Брест, 27–28 июня 2024 г.) / Мемориал. комплекс «Брестская крепость-герой»; редкол.: А. А. Коркотадзе [и др.]. – Брест, 2024. – С. 88–96.
7. Богданова, И. Ф. Сотрудники и авторы подпольной брестской областной газеты «Заря» в воспоминаниях и материалах государственных, ведомственных и семейных архивов / И. Ф. Богданова, Н. Ф. Богданова // Библиотечно-информационный дискурс. – 2024. – Т. 4, № 2. – С. 20–50. https://doi.org/10.5281/zenodo.14670498
8. Богданова, И. Ф. Газета «Красноармейская правда»: страницы истории / И. Ф. Богданова // Библиотечная и книжная культура в контексте истории и современности региона : сб. ст. всерос. науч.-практ. конф. с междунар. участием (г. Смоленск, 29 марта 2024 г.) / Смолен. гос. ин-т искусств, Каф. библ.-информ. деятельности ; науч. ред. и сост.: Т. Н. Ладожина, Н. В. Никитина. – Смоленск ; Курск, 2024. – С. 26–40.
9. Богданова, И. Ф. Белорусская прифронтовая печать в период Великой Отечественной войны / И. Ф. Богданова, Н. Ф. Богданова // Библиотеки в информационном обществе: сохранение традиций и развитие новых технологий. Тема 2024 года – Библиотечно-информационная деятельность в среде меняющихся социальных условий и технологических инноваций» : докл. VI Междунар. науч. конф., Минск, 5–6 дек. 2024 г. / Бел. с.-х. б-ка им. И. .С. Лупиновича НАН Беларуси ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2024. – С. 210–224. https://doi.org/10.5281/zenodo.14162311
10. Богданова, И. Ф. Белорусская периодическая печать в период Великой Отечественной войны / И. Ф. Богданова, Н. Ф. Богданова // Библиография и книговедение. – 2025. – № 3. – С. 71–90. https://doi.org/10.25281/2411-2305-2025-3-71-90
11. Богданова, И. Ф. Белорусские сатирические издания периода Великой Отечественной войны / И. Ф. Богданова, Н. Ф. Богданова // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов: к 80-летию Победы в Великой Отечественной войне (1941–1945) : материалы VIII Междунар. науч. конф. (Москва, 28–29 мая 2025 г.) / сост.: Н. В. Вдовина, А. В. Николенко. – М. ; Мн., 2025. – С. 24–29.
12. Климович, И. Е. Краеведческий информационный проект гражданско-патриотической направленности Брестской центральной городской библиотеки им. А. С. Пушкина «И в камне, и в бронзе, и в памяти сердца» / И. Е. Климович, И. Ф. Богданова // Библиотечно-информационный дискурс. – 2024. – Т. 4, №1. – С. 50–62. https://doi.org/10.5281/zenodo.12704249
13. Богданова, И. Ф. Проект Брестской центральной городской библиотеки им. А. С. Пушкина «И в камне, и в бронзе, и в памяти сердца» / И. Ф. Богданова, И. Е. Климович // Сохранение исторической памяти о Великой Отечественной войне: роль библиотек : материалы Всерос. науч.-практ. конф. (14–15 мая 2025 г.) / Рос. гос. б-ка ; сост.: И. П. Тикунова, М. В. Нерюева. – М., 2025. – С. 41–42.
14. Бабарико-Омельченко, В. Круглый стол «Дорогами борьбы к освобождению», [4 июля 2024 г.] / В. Бабарико-Омельченко // Белорусская сельскохозяйственная библиотека: новости, события, комментарии : информ. бюл. – 2024. – № 3 (128). – С. 2. – URL: https://belal.by/images/bulleten/128-3-2024.pdf (дата обращения: 08.12.2025).
15. Бабарико-Омельченко, В. Круглый стол «Дорогами борьбы к освобождению», [24 июня 2025 г.] / В. Бабарико-Омельченко // Белорусская сельскохозяйственная библиотека : новости, события, комментарии: информационный бюллетень. – 2025. – № 2 (131). – С. 2. – URL: https://belal.by/images/bulleten/131-2-2025.pdf (дата обращения: 08.12.2025).


## References


1. Zhuk V. N., Babaryka-Amelchanka V. B. *History and activity of the Belarusian Agricultural Library. Book 1. Prehistory and formative years* (1957–1974). Minsk, Kovcheg Publ., 2020. 228 p. (in Russian).
2. Marozau V. N. Staff members of the Belarusian Agricultural Library – participants of the Great Patriotic War: M. L. Zhuk, A. A. Guk, Ya. T. Kondratenkov, N. P. Latyshev. *Bibliotechno-informatsionnyi diskurs* = Library & Information Discourse, 2024, vol. 4, no. 1, pp. 73–81 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.12704267
3. Bogdanova I. F. Flowers of Victory. *Sel'skoe khozyaistvo Belarusi skvoz' prizmu nauchnykh issledovanii: doklady III Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii priurochennoi k 80-letiyu Pobedy v Velikoi Otechestvennoi voine, Minsk, 26 sentyabrya 2025 g. = Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025.* Minsk, 2025, pp. 105–130 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.17097982
4. Bogdanova N. F. Plant breeders who participated in the Great Patriotic War and modern breeders in the field of ornamental horticulture, authors of plant varieties dedicated to the Great Patriotic War. *Sel'skoe khozyaistvo Belarusi skvoz' prizmu nauchnykh issledovanii: doklady III Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii priurochennoi k 80-letiyu Pobedy v Velikoi Otechestvennoi voine, Minsk, 26 sentyabrya 2025 g. = Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025.* Minsk, 2025, pp. 223–235 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.17098104
5. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. "Zarya" – a partisan newspaper. *Bibliotechno-informatsionnyi diskurs = Library & Information Discourse*, 2024, vol. 4, no. 1, pp. 13–41 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.12704216
6. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. Brest regional newspaper "Zarya" during the Great Patriotic War: preserving memory. 1944 g. *Nasledie osvobozhdeniya Belarusi v istoricheskikh issledovaniyakh i semeinykh arkhivakh: materialy mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii (Brest, 27–28 iyunya 2024 g.)* [1944. The legacy of the liberation of Belarus in historical research and family archives: proceedings of the international scientific and practical conference (Brest, June 27–28, 2024)]. Brest, 2024, pp. 88–96 (in Russian).
7. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. Staff of the Brest underground regional newspaper 'Zarya' in memoirs and materials of state, departmental and family archives. *Bibliotechno-informatsionnyi diskurs = Library & Information Discourse*, 2024, vol. 4, no. 2, pp. 20–50 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.14670498
8. Bogdanova I. F. Newspaper "Krasnoarmeyakaya Pravda": pages of history. *Bibliotechnaya i knizhnaya kul'tura v kontekste istorii i sovremennosti regiona : sbornik statei vserossiiskoi nauchno-prakticheskoi konferentsii s mezhdunarodnym uchastiem (g. Smolensk, 29 marta 2024 g.)* [Library and book culture in the context of history and modernity of the region: collection

of articles of the All-Russian scientific-practical conference with international participation (Smolensk, March 29, 2024)]. Smolensk; Kursk, 2024, pp. 26–40 (in Russian).

9. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. Belarusian periodical front-line press in the period of the Great Patriotic War. *Biblioteki v informatsionnom obshchestve: sokhranenie traditsii i razvitie novykh tekhnologii. Tema 2024 goda – Bibliotechno-informatsionnaya deyatel'nost' v srede menyayushchikhsya sotsial'nykh uslovii i tekhnologicheskikh innovatsii»: doklady VI Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii, Minsk, 5–6 dekabrya 2024 g. = Libraries in the information society: preserving traditions and developing new technologies. The theme for 2024 – «Library and information activities in the environment of changing social conditions and technological innovations»: proceedings of the VI International scientific conference, Minsk, December 5–6, 2024.* Minsk, 2024, pp. 210–224 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.14162311
10. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. The Belarusian periodical press during the Great Patriotic War. *Bibliografiya i knigovedenie = Bibliography and Bibliology,* 2025, no. 3, pp. 71–90 (in Russian). https://doi.org/10.25281/2411-2305-2025-3-71-90
11. Bogdanova I. F., Bogdanova N. F. Belarusian satirical publications during the Great Patriotic War. Berkovskie chteniya. *Knizhnaya kul'tura v kontekste mezhdunarodnykh kontaktov: k 80-letiyu Pobedy v Velikoi Otechestvennoi voine (1941–1945): materialy VIII Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii (Moskva, 28–29 maya 2025 g.)* [Berkovskye chteniya. Book culture in the context of international contact: to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War (1941-1945): proceedings of the VIIII International scientific conference (Moscow, May 28–29, 2025)]. Moscow; Minsk, 2025, pp. 24–29 (in Russian).
12. Klimovich I. E., Bogdanova I. F. Local history information project of civic and patriotic focus of the Brest Central City Library named after A. S. Pushkin «In stone, and in bronze, and in the memory of the heart». *Bibliotechno-informatsionnyi diskurs = Library & Information Discourse,* 2024, vol. 4, no. 1, pp. 50–62 (in Russian). https://doi.org/10.5281/zenodo.12704249
13. Bogdanova I. F., Klimovich I. E. The project of the Brest Central City Library named after A. S. Pushkin 'In stone, in bronze, and in the memory of the heart'. *Sokhranenie istoricheskoi pamyati o Velikoi Otechestvennoi voine: rol' bibliotek: materialy Vserossiiskoi nauchno-prakticheskoi konferentsii (14–15 maya 2025 g.)* [Preserving the historical memory of the Great Patriotic War: the role of libraries: proceedings of the All-Russian scientific and practical conference (May 14–15, 2025)]. Moscow, 2025, pp. 41–42 (in Russian).
14. Babaryka-Amelchanka V. Round table "Along the roads of struggle to liberation", [July 4, 2024]. *Belorusskaya sel'skokhozyaistvennaya biblioteka: novosti, sobytiya, kommentarii: informatsionnyi byulleten'* [Belarusian Agricultural Library: news, events, comments: information bulletin], 2024, no. 3 (128), p. 2. Available at: https://belal.by/images/bulleten/128-3-2024.pdf (accessed 08.12.2025) (in Russian).
15. Babaryka-Amelchanka V. Round table "Along the roads of struggle to liberation", [June 24, 2025]. *Belorusskaya sel'skokhozyaistvennaya biblioteka: novosti, sobytiya, kommentarii: informatsionnyi byulleten'* [Belarusian Agricultural Library: news, events, comments: information bulletin], 2025, no. 2 (131), p. 2. Available at: https://belal.by/images/bulleten/131-2-2025.pdf (accessed 08.12.2025) (in Russian).